Уладзімір Цішуроў

# Маўчана



Уладзімір Цішуроў

# М А Ў Ч А Н А

Вершы

Мінск
2001

Цішуроў У.
Маўчана: Вершы / Уладзімір Цішуроў. 2001. — 96 с.

Уладзімір Цішуроў найбольш вядомы як празаік, арыгінальны й непасрэдны. Героі яго, як правіла, дзівакаватыя вяскоўцы, якія шмат чаго ведаюць, і абавязкова кожны носіць у сабе нешта незвычайна важнае, святое, без чаго на грэшнай Зямлі чалавеку ўвогуле не пражыць...

Цішуроў-паэт трошку інакшы, але не настолькі, каб у нечым адставаць ад сябе-празаіка. Дыяпазон яго лірычных стасункаў даволі своеасаблівы й шматпланавы — гэта нібы дзённікавыя накіды, акварэлькі душы ў спыненым імгненні.

© У. Цішуроў, 2001



*Я хачу, каб з вернавай міласці —*
*хоць адна душа ўваскрасілася.*
*У. Цішуроў*

## МУЗЫКА ЗОРАЎ

Я чуў учора
музыку зораў...
Яны маўчалі,
і не крычалі —
на горад пазіралі:
на мітусню,
разборкі, тлум,
на нечы звярыны сум.

Я, каб не стацца зверам,
адчыняю дзверы
кватэры...
Зоры
спявалі хорам
мелодыю цішыні,
і дабрыні,
і чысціні...

З зорамі
сэрца гаворыць...
Гляджу на зоры.

* * *

Як у здзічэлых лясах,
як у глыбокіх снягах —
я заблукаў у гадах...
Мой светлы бераг любові,
ты мне ўжо свяціць адмовіў.
Мой светлы бераг любові —
праз дзікія ўсе лясы,
праз бедаў маіх маразы,
праз лёсу майго
снягі
й жорсткіх дзён трыснягі,
паклічу свой дзень верасовы,
не выбі мяне з каляі...
Унямелы,
знайду праўды словы,
але — ад яе, ад любові...
Іду,
іду да любові!

# МАЦІ

***1***

Якія
цёплыя далоні,
якія
мяккія далоні
ў маці!
Крый Бог,
давядзецца ўпасці —
хто мяне падыме?
Маці.
...Калі гора нахлыне,
толькі
ў матчынай хаце
можна як след
акрыяці.

***2***

А цяпер мяне будзіць ранак.
А калісьці будзіла мама...
Дзе ні стану, куды ні зайду я,
не пачую голас матулі.
Не надзелены помстаю, звадамі,
без матулі ў журбе я падаю.
Падаю, як былінка на ветры,
і ў падзенні хапаю паветра.
О, каб вушы мае пачулі
хаця слова адно матулі.

Мне не ўлежна і мне не ўежна —
ад паводзін сваіх залежу.
І цяпер мяне будзіць ранак,
а калісьці будзіла мама...

*3*

Як табе спіцца,
што табе сніцца
там, у зямліцы
сырой і глухой?
Падаю ніцма
да пяску, да зямліцы,
і на абліччы
слязу
каму пакажу...
Мне не пазбыцца
тугі невыноснай,
нямой
і сляпой.
Мама за вароты
пайшла незваротна.
Найсамы гаротны
і чорны той шлях
у маіх вечных
гаручых слязах...
...Глядзіш, задуменная,
з фота.
Пайшла незваротна...
А я ўсё не веру,
што не адчынеш
у хату
дзверы...

*4*

Здабывалі маці харчы нам
і не бачылі маці маршчынаў.
Не глядзеліся ў люстэркі,
не рабілі на пекнасць прымерку,
а да бляску мылі талеркі.
Як не ношкамі гора зношвалі,
пасталеннем нашым стрыножаныя.
За *сталенне*
я ў мамы прашу прабачэння.
І памылкі мае, і няўдачы —
праз маму выходзілі плачам...
Мой учынак неасцярожны —
маці кожны раз устрывожваў.
І я — да сівых валасоў —
крадма адсоўваў засоў,
калі ад каханкі вяртаўся дамоў.
Я — то ў пакуце, то ў драме.
І ў драме — мая мама...
Адкуль бы цяпер ні прыйшоў,
ніхто не адсуне засоў.
Каму раскажу сваю драму?..
Смерць вынесла з хаты маму.
...Моўчкі адсуну засоў —
і падаўлюся горыччу слоў.

*5*

Мама...
Віхуры — белыя ведзьмы,
як пасланцы кляцьбы,

пнуцца ў нашыя клеці
з вечара да дасвецця.
Вырылі норы краты —
уцякаюць ад неманы.
Я ў хаце, як у нары...
Адзіноцтва — балючы нарыў —
да якой мне насіць пары?..
Мама...
Над грудочкам, дзе ты,
ведзьмы — віхуры белыя —
кружацца ў танцы нема...
Мама...
Хата — нема, як яма...
Я якой дачакаўся пары?
Адзіноцтва — балючы нарыў.
...Трэба ісці на прарыў!
Ад нарыву і ад нары...

***6***

Ты —
не на яве,
а толькі ва ўяве.
Ты —
у глыбокай, глыбокай
яме,
дзе бярозы старыя крэкчуць...
Мае вусны
табе штось шэпчуць.
Праз пяску
і гліны таўшчу́,
што табе я не прашапчу,

ты не ўчуеш —
на кладах
жывеш і начуеш,
не дома,
не ў хаце,
а на сваёй, як казала,
краваці.
Мама,
мне цяпер за цябе
трэба ўсіх сустракаці.
Па табе ўсё плача.
І ўсё раве.
Твой кіёчак —
дахаты цябе заве...
Усё ў журбе
і ў вялікай страце —
няма
мамы-матулі-маці...

*7*

Мама,
я цяжка хварэю.
Мама,
памылка — зрабілася драмай...
І грэх —
і гэта не смех —
не вядзе да шчаслівых уцех,
а туды, дзе наспех
капаецца чорная яма.

Грэх —
і немасці яма...
Ты ўжо мне не паможаш,
мама...
І — ні духу твайго,
ні душы.
Ну няўжо я грахамі
свой шлях завяршыў?..

### *8*

Сівым аблокам —
небам плыць.
Нам час не дадзена спыніць.
Здранцвелі травы...
Мама спіць.
Матуля, сну твайго не чую —
ля сну твайго
штодня хаджу я...
І словам я сябе ратую!

Які ў цябе няўтульны ложак...
Дзе жвір з цямрэчаю варожыць —
ніхто твой сон
не патрывожыць!

Ад злосных слоў,
як ад варожай кулі,
тут, ля цябе,
знямела-ўмярцвелай,
упаду я...

І хай мне слова ворага
    балюча сэрца коле —
    пайду да хаты,
    ацалелы,
    наваколлем.

Падумаць боязь —
    з таго свету,
    з амярцвення,
ты ўсё яшчэ мне
    дасылаеш
    ацаленне.

* * *

*Л.Д.*

Не кліч
кляцьбу з нябёсаў —
не дадавай кляцьбы
майму лёсу.
У кахання —
святочны твар.
Мы — без свята...
Як з перапалоху,
плоць балюе,
кахання — ні крохі...
І за слабасць сваю —
адмаліся,
і ад нас, ад такіх,
адвярніся...
Жыць не будзеш маной —
ні з людзьмі,
ні з сабой,
ні са мной.

* * *

Нясу на сабе сто мяхоў
сваіх і чужых грахоў.

Не завіце мяне гадзюкай
і Кашчэя худога ўнукам.
Я не смехам смяюся — рогатам.
Скачуць д'яблы ў душы —
іх многа там.
Каб пазбавіцца чорнай напасці —
к беласнежжу хачу прыпасці.
Я люблю першы снег
і сняжынкі,
што саткуцца белай хусцінкай
у полі
зімы рукою.

Прыпаду к беласнежжу рукою,
прыпаду к беласнежжу душою —
і супакою сябе...
Супакою!

## КРЫЖЫ

*М.В.*

Мы дайшлі з табой
да мяжы.
За мяжою —
крыжы...
Ці былі мы ў ілжы,
ці
ў здрады імжы?
Мы дайшлі да мяжы.
Не паспеў я крыкнуць:
«Бяжы!
То ж —крыжы
на пахаванне
нашага кахання...»
На кім болей ілжы?
Мы бяжым уначы.
Мы крычым
на крыжы...
Я крычу:
— Раскрышы крыжы!..
І адзін стаю — у імжы.
І адзін стаю — у ілжы
ля мяжы.
...А навокал —
крыжы!

* * *

Я тваю цішыню
мо крану
самым цёплым,
лагодным ветрам.
А вада ачышчаецца ў нетрах.
У любові — святое паветра.
Я згараў — нечалавечна.
Я згараў — як камета.
Як бураю ліст знявечаны,
падаў...
Як кахаць — не даю парады.
Сэрца кахаць — рада!
Ці ж не на святло кахання
сеецца змрок непрызнання?..
Ці многа толку —
ад змроку?
Да любові й кахання
колькі зробіце крокаў?..
А такое маё жаданне —
у каханні:
не жадаю вам змроку,
не жадаю...

## НЯЎЖО?..

Я — не піжон.
Як святло,
як надзея,
ты —
памерла...
Няўжо?
Сум сумненняў пасеяў —
не пасеяў надзеі...
Няўжо?
Ты —
крыштальная фея.
Ах, якія мае надзеі?!.
Гэткі грэшны я —
безнадзейна.
Убрудзелы я
і прыніжаны...
Безнадзейнасць на памяць
ніжыцца,
нібы чэк
на цвічок.
Драматычная ты падзея...
Безнадзейна ўсё.
Без-на-дзей-на!..

## ВОЧЫ СІНІЯ...

У валошкі —
вочы сінія...
І не трошкі.
Вочы сінія,
неба сіняе.
«Ну вядзі мяне...
Правядзі мяне!..» —
просіш ты.
Дазвання
дух мой звяне.
Некаханая,
нежаданая,
і вадзіцца з табою —
не стану я.
Неба сіняе,
вочы...
А ці бачыў хто
вочы
жанчыны ўночы?
Ах, калі кабета
спіць адна,
нікім не сагрэта —
і не неба ёй сніцца сіняе,
а — *мужчына*
не знясілены...
Неба сіняе,
вочы сінія...
Абнясі мяне
ад знясілля!..

## РАДАЎНІЦА

Радаўніца,
ды аніхто не радуецца —
скіраваныя позіркі ўніз,
дзе ляжыць
непрыкаяны ліст
на ссівелай
і белай траве, —
заняпалы,
прапалы,
з дрэва ўпалы...
Ліст нібыта жыве.
Мы жывем і гарым.
І згараем
у трывозе
і барацьбе,
у пакутах —
спрадвечнай сяўбе...
Мы глядзім уніз:
ці на ліст,
а ці то на сябе?..

* * *

У сварках
ды звадках —
пад сход альбо поўна —
паміраюць людзі
раптоўна.
Жыць бы нам палюбоўна!
Прыкметы
трагічнай аздобы —
нашы болі й хваробы.
Хваробы,
не зважаючы на асобу,
знішчаюць нас
паасобна...
Я са смерцю развагу вяду
памяркоўна:
можа, ёй сярод смердзі
й грызні
патрэбна крыху крыві
нашай,
чалавечай,
хаця б — у нечым?..

* * *

*Ірыне*

Вольная,
свавольная,
я сустрэчу
з табой — не адпрэчу!
Нехта сумна купляе рэчы,
а я —
суму свайму пярэчу
і прагну таксама вольніцы
ад чорнай планіды-свавольніцы...
Крок мой —
перад табой
за-па-во-ліц-ца.
І душа на святло тваё —
моліцца...
Хай жа табе сваволіцца!
Смяецца ў радасці Бог
за грэшны
й бязгрэшны
твой
крок...

# У ВЯНОК КАХАНАЙ...

*Ірыне Л.*

***1***

Я цябе зусім не прыдумаў —
пра цябе адну мае думы.
Я зусім не прыдумаў цябе —
і трывога мяне дзяўбе,
нібы дзяцел цвёрдаю дзюбай:
я цябе не назваў яшчэ любай!
У маім небе, самотай прагорклым,
я малю: будзь жа светлаю зоркай!
Для чаго гэта ўся гаворка
і тамленне маё, і маленне?..
Вырвеш дрэва любові з карэннем,
згіну я без гэтага дрэва.
Ці так трэба, скажы, ці так трэба?
Мо пустыя мае літанні
ад змяркання і да світання?..
Надакучылі мне пытанні —
хоць застанься
*Зоркай Кахання!*

***2***

Расхвалюеш мяне
непрыкметна.
Ты —
нібыта таемная кветка!

Ды ў той загадцы-таемнасці,
як у сонечным дні,
поўна светласці!
Можа, я —
той дзіўны прамень,
што імкне ў твой
сонечны дзень?
Можа, хмара я
самая
чорная?
Можа, чорны — я?..
Анічога мне не кажы —
я даўно стаю ля мяжы
твайго светлага дня
і малю твайму дню:
святла і агню!
Дзень з ноччу
разам не крочаць...
Ты —
увасабленне
светлага дня.
А хто ж — я?

*3*

Снежань...
Снягамі не снежыць.
Ты схавалася ў Белай вежы,
і каму тваё сэрца належыць?
А я грукаю ў вежы сцены.
Поле белае, нібыта сцэна.

І на полі — я, Дон Кіхотам,
і далёка — не Дон Жуанам...
Узмакрэю халодным потам:
«А што ж будзе са мною — потым,
кім я стану, і чым я стану?»
Думкі зблытаны ў Дон Жуана.
Мае думкі табою — не зблытаны,
на праверку я не апытаны,
і каханне нясе мне іспыты...
Хай гучаць мае словы нявінна —
і твая ў гэтых словах правіннасць...

*4*

Сярод тлуму і шэрасці
аблачыне маёй шчырасці
ўдасца з-за хмараў выплысці...
Аблачына,
нявінна,
паміж космасам
і зямлёй
праплыве над табой...
Я дарую табе спакой!
Ты ідзі дарогай сваёй —
шчасця-долі табе
на век твой!
І развеецца аблачына...
Вецер сіберны — твой.
Не мая ты. І я — не твой...
Над табою і нада мной
аблачына *любові* плыла.

Аблачына любові... Была...
Яна — і прычына,
ад якой
у маім сэрцы боль.
...І сустрэча
з табой —
зусім недарэчы.

***5***

Жыву праз боль,
што ты пакінула мне...
Табой
сэрца ўжо не жыве.
З якой
прычыны такой
сцежка зводзіць з табой?
Ты — боль...
Я шукаю вады гаючай —
кожнай стрэчай з табой
атручан!..

***6***

Столькі волі
ў цябе
і сваволі,
ты не выйдзеш з мяне
аніколі.
Прабачацца —
не прабачацца,
усміхацца

ці не ўсміхацца —
гэта будзе табою рашацца.
Свет, канешне,
стаў пагаршацца...
За ранейшае мне
не брацца:
да цябе —
не спяшацца,
кветкам нам —
не ўсміхацца,
у абы-што —
абы-як апранацца...
З кім вітацца
і як вітацца,
калі раптам
пачне змяркацца?
Мы —
самаабкрадцы.
...Як ад страшнай турмы —
ад сябе бяжым
мы.

*7*

У хоры
людскіх галасоў,
у хуткаплыні часоў
мажліва мяне ты ўчуеш
у цішыні
самай чуйнай...

Прагу любові ніяк
не спатолю —
не хачу быць тваім болем...
І поле
любові
няўжо мы прайшлі
да канца?..
Да абрыву,
як глуха там,
пад абрывам,
дзе цемра
ўсміхаецца крыва.
Локці кусаю да болю:
дзе ж яны,
крылы любові?

***8***

У летуценняў
няма смеласці.
Ад летуценнасці
да скамянеласці —
адзін крок...
Ну зрабі,
ну зрабі мне папрок —
быў, мажліва, памылкай
мой крок.
У сэрцы мроі
ляталі роем...

Ці з надзеі,
ці з ласкі лета
ўсё ж былі
любові прыкметы.
І ляталі гуллівым роем
у маім сэрцы
кахання мроі...
Ну і быў я, канешне, героем.
Я цяпер —
за халоднай імжою
ў драматычна-тужлівай ролі...
І не рояў ува мне,
і не мрояў...

## ПАМІЖ МНОЮ ДЫ ІМ...

*М.С.*

***1***

Дождж...
Аўтавакзал маркоціцца,
ад цябе душа не адкоціцца,
а пабіты аўтобус коціцца,
а душа мая, быццам шар,
а ў тым шары — твая душа,
а душа твая ў шары люляецца...
Не, і гэта не забываецца,
хаця — мары й збываюцца,
нашы мары не забываюцца.
...А пабіты аўтобус коціцца,
а ў дожджык вакзал маркоціцца,
а душа мая, быццам шар,
а ў тым шары — твая душа...
Ах, шчаслівая тая шаша,
*Горкі— Арша!*

***2***

Мы жывем з табою былым.
І плыве паміж намі дым.
Дым любові — над светам расстанняў.
Назавем гэты дым каханнем.

Не задыхнемся ў гэтым дыме.
Гэты дым нас над светам уздыме,
стане шчасным кароткі палёт
над дакукай і бруднай зямлёю.
Я ў тым дыме —
з табою, з табою, з та...

*4*

Не кахае сэрца дваіх, не кахае.
І, напэўна, мяне ты хаеш —
альбо проста — адпачываеш...
Цяпер іншыя твае дні —
з мужам ты, не адна, пры сям'і.
Ды, як толькі прыпомніш былое,
раптам стане з табою — двое...
На хвілінку нязвыкла прыстоіш —
ды сябе аніяк не раздвоіш.
І пакліча цябе — другі
на надзейныя берагі.
І ты пойдзеш стамлёнай хадой...
А я — побач пайду з табой.
Паміж мною ды ім — ідуць войны,
а ў табе, у тваім сэрцы, — раздвоенасць...
Але я ўсё ж цябе пакіну — будзь жа з ім,
сваім сем'янінам.
І без болю, без роспачных слоў
выйдзеш ты з маіх мрояў і сноў.

# ТРЫ ВЕРШЫ

*М.О.*

***1***

Гукні мяне
праз дваццаць адзін год,
я голас твой напэўна распазнаю —
я не святы,
ты не святая,
але адзін аднога, спадзяюся,
мы пазна́ем.
Успомніўшы каханне,
памаўчым —
яно яшчэ нас, хоць на час з’яднае.
Яно рэальна,
як ссівелы дым,
з якім наш быт да неба адплывае.
Няхай кароткім здасца гэты час,
гаючы час —
без пошасцей і здрады...
Мы хоць крыху
абое памаўчым...
Я рады буду.
Ты — ці будзеш рада?
Час, у якім святло і праўда...
Праўда?
Гукні мяне
праз дваццаць адзін год!

*2*

Дзень без сонца
ў маркоце застыне,
і сівее трава
на сцяжыне...
Шэпча вецер
не малітоўна,
і душа без цябе,
як пустая царкоўня,
ці без шпака —
шпакоўня.
Мы вяртаемся ўсё роўна —
як багамольцы
ў царкоўню,
збіўшы ногі,
забыўшы на сны
да духмянай вясны,
у белы хорам любові...
Бы ў змове,
хтосьці — позна,
а хтосці — рана,
каб не стрэцца
і адзін аднаго
не раніць.
Як у выратавальны
Эдэм,
мы да храма любові —
ідзем і
ідзем...
Хай сівее сцяжына,
гэты шлях — не чужы нам,
Ма-ры-на...

### *3*

Праз гады —
усміхаешся ты
безабаронна...
Мой анёл,
я, мажліва, страціў усё...
Скароны,
з белай —
чорнай раблюся варонай.
Усміхаешся ты —
праз гады,
безабаронна...
Толькі тым
я святы,
што быў
белай калісьці варонай
і кахаў цябе
базабаронна.
Мой анёл,
я, мажліва, страціў усё...
І — жабрацкім стала жыццё.
Калі палу ў душы бракуе,
то душа — жаб-ра-ку-е...

Тым,
былым, —
святы...
Усміхаешся *Ты*!

## ЗВАНЫ ЛЮБОВІ...

Покуль звоняць
любові званы,
супакояць яны
і суцешаць яны.
Ды з якой стараны
нам зазвоняць званы?
Не чакаю звону чужога,
я званю міласэрна
і строга —
звон плыве
да твайго парога.
Калі ж ты
не ўчуеш той звон,
калі ў сэрцы тваім
не застанецца ён —
пойдзе звон
на скон.
Звону скананне,
як скананне
кахання...

# ХАТА

*1*

Пацук бервяно грызе.
Праз дзіркі холад паўзе
слізкім уюном ці змеем —
хата мяне ані грэе...
Холаду змеі
чакаюць, пакуль захварэю.
Ды настрою няма — улову —
каб змеям ссекчы галовы...

*2*

Хто ведае мае страты?
Дарогі
ды сцены хаты.
Я страты ўжо не лічу
і — сярод хаты крычу...
І з хаты тае штодня
сыплецца парахня.
І хата мяне, старая,
узімку ледзь-ледзь саграваe.
Старая яна, старая,
хата мая нямая.
Калі прадсмяротна
шапну: «Бывайце...»,
то ў хаце маёй
мяне адшукайце...
І — пахавайце.

* * *

Як самы шкадлівы школьнік,
калі я пасеяў крыўды
ў душах людскіх
і болі?..
Вучуся ў школе жыцця —
да забыцця.
І крыўды, што сеяў,
і болі —
б'юць мяне ў сэрца да болю.
Зольна на сэрцы,
хмарна —
жыццё пражываю марна.
Бог пазірае карна
на маю пустэчу-бяздарнасць.
Я сам сабой пакараны —
крывавіцца раны
на сэрцы,
напэўна, будуць
да смерці...

* * *

Я — нічыйны,
як кот памыйны,
закарэлы й брудны,
як свінка...
Мною кіруюць інстынкты.
Я — не вабны
й непрывабны.
І ў спешцы —
у непрыгожай адзежцы.
А калі я вясёлы,
то падобны —
анёлу!
Для анёльства
патрэбна свавольства!
Покуль жыў
я, свавольны,
не ўволю.
І сябе — не спатолю...
Да жыцця
я навошта прыбрыў?
Калі стану там, дзе абрыў, —
упаду ў апрамець не анёлам.
Хтосьці скажа:
«Зямля яму — колам!»
Значыць — не ўсё
было вясёла,
і не заўсёды быў я анёлам.

* * *

Ах, жанчына-пяшчота,
ты — для цела работа.
А душа — як пры вечнасці,
у дрыжы-халаднечнасці...
Халаднечу хаваю —
ля печы
душу саграваю.
Ды ля печы
грэюцца толькі плечы...
Я ў лёсу ці дня
папрашу:
«Сатвары пакаяння імшу!»
(Бо, мажліва, грашу...)
Каб маёй узгарэцца крыві,
мне трэба паболей любві!
Я здароўя не падлячу,
усе страты — не палічу.
І не буду ў маркоце,
як ачнуся ў кахання палёце...
Не баюся,
што не прызямлюся!
А заглохне сэрца-матор
у палёце —
дзядзькі й цёці,
не шліце дакор.
Ваш
плямяш
ад кахання — памёр...
А яшчэ ж я — жывы
й на каханне маю правы!

## РАЗУМЕЮ...

*1*

Сэрца спуджана тукае,
сумленне з сорамам ссукае,
да мужа чужога пастукае...
...А раніцою, ночкаю змята,
прыбрыдзе да бацькоўскае хаты —
і ў хату ўвойдзе са стукам
ужо не дачка, а... сука.

*2*

Гнеў
нервы й здароўе з’еў.
Муж — як не прапаў —
ва ўдовіных хатах спаў.
Рэўнасць і боль,
як на раны — соль...
Разумею цяпер,
чаму маці
гэтак шалела ў хаце...
У бацькавых вачах —
жах.
...Ці не іду
па яго слядах?

# ПАЭЗІЯ

***1***

З патугай,
з напругай
даецца Паэзія...
Далёкая,
як Паланезія,
шукае сваім хітрым вокам
Паэтаў
Паэзія.
Да Паэтаў у яе —
прэтэнзія:
запрашаюць рэдка,
і частуюць поснаю рэдзькай.
Я ж — зусім не знаёмы
з Паэзіяй,
наравістаю,
ганарыстаю.
Не ратуйце мяне
аніякай магнэзіяй:
я хацеў бы памерці —
у абдымках з Паэзіяй!

***2***

Праўды слова —
не слава...

І Паэзія — не забава.
Павядзе яна ўсіх нас,
грахамі кляймёных,
да апосталаў —
даўно знаёмых.
Павядзе нас,
атручаных Каінаў,
да грахоў прызвычаеных:
перад Праўдай — пакаяцца,
перад Сумленнем — пакаяцца,
і пакаяцца ў справах брудных —
Брутаў,
Каінаў.
Перад Богам — пакаяцца,
перад Маці — пакаяцца.
...Гэтым вершам — я
пакаюся.
Як вада ў нетрах,
ачышчаюся
светлым
паветрам
Любові.
Хтосьці прагне помсты й крыві, —
дайце яму любві!
Ён у цемры, у крыві ён —
і забыў на жыцця закон.
А жыцця закон —
зноў паўстане:
«Жывіце ў любові й каханні!»

***3***

Не адкажаш прыгожымі рысамі,
для чаго кожны верш напісаны...

Я хачу, каб з вершавай міласці —
хоць адна душа ўваскрасілася.

Каб душа — не сытая кашай —
пашукала для роздуму пашы.

Будняў шэрых забыўшы паўторы,
пашукала новых прастораў.

Не, паэзія — не блудніца:
яна кліча шукаць таямніцы,

каб з таго, што ў небе, каўша
напілася дзівос душа!

* * *

*В.*

Не жадаю нікчэмнае волі.
І палоніць сэрца туга...
Я — раб тугі
й слуга...
Тузе —
не ў паслузе.
Ты — на шчаслівым беразе!
Унямела глядзяць берагі
Вол-гі.
Ад тугі,
ад нуды,
праз камяні й перашкоды
бягуць-уцякаюць воды...
Хоць сэрца маё
пад прыгнётам —
*бязгукавым* самалётам
я над табою
лётаў і лётаў!
Пазбаў мяне, Воля,
самоты —
хоць на ёту...
І цяпер,
дый — потым.

## СКРУХА

У гады я зайшоў далёка.
І ў одум заплыў глыбока.
Я гляджу невясёлым вокам
на стракаты й зацюканы свет.
Гэты свет — чый запавет?
Як мёд — муха,
упадабала мяне скруха.
Праз снягі й завірухі
ўцякаю ад скрухі.
А сама завіруха,
бы раз’юшаная скруха...
Як святога прычасця —
не ўведаў я шчасця.
Скруха
шэпча на вуха:
— Ты мяне і любі, і слухай...
Аддаю скрусе даніну —
хапаюся за саламіну
(хтось хапаецца за саланіну).
І зраблю я адчайны крок —
будзе горкі мне ўрок:
святлу пасміхнуся,
каб згінуць скрусе...
Хай у душы маёй жытло
ляціць жыцця святло!

## ПРА МАНУ

Часам за ману
даюць высокую цану...

Удаецца быць мане —
у цане.

Ах, ты родная старана!
А кругом — мана, мана...

Абмануў сусед суседа,
абманула бабка дзеда,

абмануў чынуш народ...
Не, было наадварот!

Падмануў настаўнік вучняў —
ён з маною неразлучны.

Як з маною шлюб займеў —
амярцвеў і анямеў.

Ах, з маной не маю згоды —
дайце мне з маной разводу!

## ДЗЕНЬ-АЛЕНЬ

Роўны мой дзень,
        ды няроўна дарога.
Дзень мой — алень,
        імчыць ад парога.
Імчыць напрасткі,
        да прыдуманай явы,
дзе прараслі
        палынамі забавы...
Збуцвелі масткі —
        да пачосткі й славы.
Славы не той,
        што блішчыць медалямі,
а — дзе спакой
        і размова з сябрамі.
Рана збірацца
        пад шэпты бярозаў:
мо шчэ пажыцьмем,
        як глянуць цвяроза?
Кіну, забуду,
        былое схаваю —
сэрца надзею
        шчэ нейкую мае.
У клопаце жыць
        майму верасню-маю...
Мо пажыву —
        і не заўтра сканаю.
Імчы, мой алень!
Ты — у клопатах дзень,
а не прывід, не цень.
Зламаеш рогі,
ды веру — станеш на ногі!

# МАЎЧАНА

*1*

Не знямела маё захапленне,
не знямела.
Ты здаешся мне чыстай і белай,
нібы зорка-сняжынка,
што не ўпала яшчэ на зямлю...
Хто не скажа: «Люблю чысціню...»
А я Бога малю:
«Уберажы яе чысціню!»
Безграхоўна сэрцам адтаю,
на каханне сябе разрываю —
і яно не згарае...
Хвала Богу, што ёсць ты такая —
і зямная, і незямная.
Не ў маёй толькі славе,
ды ў маім толькі слове:
Ave!

*2*

Як смецце з крынічнай паверхні,
мяне не адкінь, не адвергні.
Быць
адвергнутым —
як пад чоўнам плыць
перавернутым...

Цемра,
страх
і адчай...
Мне рукі — не падавай!
Нават калі стану тапельцам,
буду сніць я тваё *свяцельца!*

*3*

Маўчана мая
не страчана.
Каханне маё
мо рас-тра-ча-на?
Хто вырашыў
адназначна,
што я для журбы
прызначаны?
Навошта мне лёс
неазначаны —
хачу быць
перайначаны!
Зняможаны пакаяннік,
у цябе,
як у Бога,
прашу даравання —
дзеля кахання!
Пажадана было б
і прыемна,
каб было яно
ўзаемным!

*4*

Ці пабудую дом?
Ці выгадую дзіця?..
Куды ты вядзеш мяне,
сцежка жыцця?
Куды й навошта
еду парожні?..
Куды не зайду асцярожна —
навокал чужыя пожні.
Журбы я астрожнік...
Праз пожні чужыя, употай,
пакіну след лёгкіх ботаў —
да цябе, ты мая любота!

*5*

Развітанне душа пачуе —
нелюбоў адразу адчуе...
І не мае сілы маленне,
каб збылося-такі ўваскрашэнне
той бялютка-затоенай хмаркі,
што па небе плыла няшпарка...
Шэры дзень — быў сонечным раннем
вось пад гэтай хмаркай кахання.
...Я ў жалобе і памінанні —
п’ю ў пустэчы абрыдлую чарку
за цябе і за хмарку!

### *6*

Дакарай мяне, дакарай.
Адганяй мяне, адганяй...
Гэта проста зусім немагчыма
мець такую ўжо мне магчымасць
з табой дыхаць паветрам адным
(без кахання паветра здаецца пустым)
і тваім дыхаць толькі духам...
Ты мяне ані будзеш слухаць.
Мой нікчэмна-пустэчны рух —
сярод летніх дзён-завірух.
Сэрца коле —
нібы хоча сказаць: «Даволі!»
Сумны дзень,
сумныя поле і доля.

### *7*

Ці прыме каханне
маё пакаянне?
Ці прыме любоў
атручоную кроў?..
Дзеля кахання —
на пакуты пайду
і пакаянне.
Ты — святаяннік.
Я — пакаяннік.

І святло святаяна
на тужлівым дасвецці
мяне, Каіна,
усвеціць...

***8***

А крынічка жыла
і чысціню сваю берагла,
як магла.
Намятала пяскі з атрутай,
маразы сціскалі пакутна.
І зімой снягі засыпалі,
святло нябёс закрывалі.
Усё стрывала, пакуты ўсе —
і жыве ў чысціні-красе!
Ля пакутнай крыніцы
ці нап'юся вадзіцы?
...Ты — як тая крыніца,
да якой
не падступіцца.

# СОНЦА Ў СЭРЦЫ...

*Н.К.*

***1***

Флірт...
Каханне — не спірт!
Як важкае саланіны,
мы хочам кахання-вячніны.
Каханне гарыць саламінай,
каханне гарыць драўнінай.
Даўно і падаўна прыкмечана —
няма анічога вечнага:
падвержана ўсё —
старэнню.
Сцверджана:
каханне — гарэнне!..
Ну не маеш кахання —
пачастуй тады хоць
варэннем!

***2***

Хто на сцежцы жыцця твайго сядзе:
чорны воран ці ты, галуба?..
Была любай...
І стала любай.
І залежу я — ад улады
аднаго твайго толькі
пагляду!

У тваім сэрцы —
схавана сонца
на старонцы
пражытых мной дзён.
Промні сонца твайго —
лепшы плён!
Хай жа б'юць
з тваіх светлых вачэй —
промні сонца ярчэй і ярчэй!

## БАЛАДА ПРА ЗГОДУ

*Памяці Л.А.*

Шаўкавісты сноп валасоў
заслугоўваў узнёслых слоў...
І звінеў смех дзявочы
бесклапотным званочкам.
Нашы душы спазналі згоду,
не цураючыся свабоды.
Згода — лёсу падарунак.
Бы забыўшы на гэты дарунак,
я мяняў пагляд і кірунак...

Ды аднойчы, ахутаны ў змрок,
я да згоды прыспешыў крок.
На Планіду ці лёс сабачы,
нехта крок мой пераіначыў.
Да святла не дайшоў аднойчы
сярод цёмнае весняе ночы...
На яве, не з фотаздымка,
у цеплыні абдымкаў,
цярпенне сабраўшы ў радно,
з зімы ў вясну — і даўно —
мяне клікала ты й акно...

Жуды за́мкам маўчала прырода —
не акно палала, а згода!
Скрыжавала свой лёс
з некаханым,
з нежаданым...

Скрыжавалася,
нагаравалася.
Сэрца ў горасці змерла —
да пакутаў сцяны прыперла.

Ты аднойчы... памерла.
З якое нагоды
я ўспомніў пра згоду?
Мяне сум да сцяны прыпёр...
Не згарэў мой дакор.
Час раве,
як гудок паравозны.
Я ўспомніў пра згоду...
Позна!

* * *

У пустыні — пяскі пустыя.
Пяском сыплюцца дні халастыя.
Што скажу я сваім жыццём
перад дня майго небыццём?..

І таму, хто спытаць ахвочы,
хто мне гэтак лёс мой скурочыў, —
пясок з ветрам сыпне́цца ў вочы...
Ён навечна згубіцца ў ночы.

## СТВАРЭННЕ ДУХУ

Праз боль
і скруху
ідзе стварэнне духу.
І ў тых сутарэннях,
дзе палае паленнем
сумненне,
дзе распуснасці змрок,
атрымаеш урок,
што ад распусты —
на сэрцы пуста...
Стлее ў прах
вугалёк надзеі,
любові й кахання:
у распуснасці путах —
ты агідны, галгане...
Пані каханка —
недасяжная зорка...
Распусты ўрок — горкі!..

## ПСІХАЛАГІЧНЫ МОМАНТ

Так не вядзецца,
што суп сёрбаюць відэльцам
з вядзерца...
Калі каханка
табе
не парачка, —
то ў га-рач-цы,
бы ў горычы
(дзеля кахання
ці сябе захавання),
суп сёрбаеш відэльцам...
І выпусціш з рук вядзерца.
Летняй спёкай
у кажух
памкнешся адзецца...
А тое хапанне
ці ўратуе каханне?

## БЫВАЕ І ТАК...

Калі ты ў нудзе,
калі ты ў бядзе —
да цябе яшчэ і Брыда
прыбрыдзе.
Раскажа табе
пра ўсё нуднае
ды паскуднае...
У Брыды
сястра — Бруда,
сястра — Блуда
і яшчэ — Нуда.
І Брут —
ёй брат,
акурат!..
Што і казаць —
толькі бруду
з аблудай
у Брыды можна ўзяць!..
Таму, каб не быць вам
нудным,
брудна-заблудным,
Каінам,
Брутам, —
частуйце Брыду
прутам...
І не будзеце мецць пакутаў.

## ДОЎГ

Даўгі —
цяжкія, бы стагі.
Колькі маюць вагі?
Як пакошаныя лугі,
даўгі дакараюць
і, бы тыя крэдыторы,
на сумленнасць правяраюць.
Аддаць доўг
не змог —
у быльнёг
сядзе доўг
і ў мох.
Чалавек ты
ці воўк —
за табой застаецца
доўг.
Ці зарыешся ў мох,
ці заб'ешся
ў калючы быльнёг —
паленнем
па сумленні,
па табе і тваім пакаленні
нечакана ўдарыць доўг.
...Смокча душу,
як смог,
і спаць не дае — *доўг...*

* * *

На пахаванні маці —
падзеі слёзнай —
сыны стаялі
й глядзелі... сур'ёзна.
Няўжо так жыццё
сярдзіта-сур'ёзна,
што сорам
і ў горы
паказваць слёзы?..
Калі душа
не дае адлігі,
мусіць, там —
ненармальнасць
ці «здзвігі»...
Ці на душы
злядзяжна і льдзінна,
што не выцісне нават слязіны?..
Жыццё сур'ёзнае,
жыццё марознае...
Калі жыццё
прыпячэ, як мароз, —
*хаваюць*
не толькі нос...
Ды — я папрашу! —
не хавайце
на пахаванні маці
душу.

* * *

Землякі
завуць верш «сцішок»,
і занятак такі
ў іх выклікае смяшок...
Мо пішу я «сцішкі»
для насмешкі?
Шаноўнае панства,
я жыву ў вас на віду
і — ведайце! —
не сыду
з паэтычнае сцежкі,
бо вершы пішу
не для насмешкі!..
З часоў паганства —
паэзіі словы
ўвайшлі ў замовы,
якімі збаўляюць ад п’янства,
махлярства,
чванства
ды ашуканства...
Землякі
чытаюць мае «сцішкі».

## ХТО ВІНАВАТЫ?..

Хто вінаваты
за пустую хату —
калі ў хаце нямой
голас толькі твой?..
Ты — пастух ці араты,
гаспадар, памагаты, —
калі лёс
цябе доляй абнёс
і даводзіць да слёз,
што ж,
сяўба твая будзе — глухая,
ад якой небыццём патыхае.
Хата твая — глухая.
Каго хаеш?
Што маеш —
тое і маеш...
Але — не сядзі,
не ўздыхай,
а — дбай,
гаспадарку вядзі...
Хоць
што-небудзь май!

* * *

Падзяліўся парламент
на партыі, фракцыі —
як у Англіі ці ў Францыі
(Лепш жывецца, канешне, у Францыі!).
Інтарэс фракцыйны,
інтарэс партыйны...
Ці пыталі ў народа
на падзел такі згоды?
Не пыталі,
бо засядалі...
Народ — сам па сабе.
Парламент — сам па сабе.
І ў гэтым раздоры
краіна,
як у процітанкавай разоры,
і ў горы.
...Жыве ў бядоце
зусім не фракцыйны народзе.

* * *

Цалую ледзь цёплыя вусны я,
якая ты ўся распусная...

І хочаш ты жыць, балюючы,
паводзін не кантралюючы.

Ні ліку няма, ні меры
тваім усім кавалерам.

І кожнага цягнеш у ложак,
і колкая ты — як вожык...

І цягнеш ты з «накруткай»
да званніца — прастытуткі...

Заўжды мы на раздарожжы —
што можна, а што няможна?..

А трэба ўсё ж чуць,
што — няможна.

І я, бач, накалоўся —
болем увесь зайшоўся.

## НААДВАРОТ

Мусіць, ведаў жыцця той пекнасць,
хто сказаў:
«Раньш за бацьку не лезь у пекла!..»
А для мяне: дзе пекна —
там пекла.
Але ж — дзе пекла,
там і бывае *пекна*!

## САБЕСЕЙБІТУ

Струхлеюць хлеўчукі.
звядуцца парсюкі...
І клопат пра сябе
штодня цябе скубе:
усё дзеля сябе!..
І бульбачка цвіце
для вока хі-жа-га...
Скажы, што ты зрабіў
для бліжняга?
Не вечна кожнага сяўба...
Ці прыме сабесейбіта —
*Неба?*

* * *

Сардэчнасць —
пустэчнасць,
крокі нашыя ў вечнасць...
Ёсць немасць быту
і немасць нябыту...
І покуль я — тут,
прывязаны да быту-пакут,
гляджу на жыццё хітраванам
спрактыкаваным —
дзеля сытасці
і дабрабытнасці...
Ды хітрасць — загана.
Я заганай
загнаны
ў забыццё...
Не даруе нічога жыццё!
Сам сабою — не распазнаны,
ды сабе не дарую заганы...

* * *

*Марыне О.*

У вокнах — сінь-чысціня.
Красавіцкая раніца
марозікам лёгкім кусаецца,
нібы забаўляецца.
Ну, а вочы твае — захапляюцца,
і душа, як анёл, здзіўляецца.

Гэтай раніцай
з намі раіцца Бог.
Ён зрабіў усё, што змог.
І ўзвысіў нас — да анёлаў,
самых шчаслівых і самых вясёлых!
Усміхаецца раніца.

Калі Бог адступіўся ад нас?..
Вінаваціцца
не раніца — мы якраз
страшнай стратаю
вінаватыя...
Мы вінаватыя.

Праз заплаканае акно
і замурзанае аўто —
даўно
выглядаеш, мо, тую раніцу?
Ды яна не вяртаецца —
любові красавіцкая раніца...

* * *

Вугал мядзведжы —
многа ежы,
зашмат адзежы.
Спі, ляжы
ля поўнай дзяжы...
Будзеш чвякаць
ды вохкаць —
і пачнеш ты ўрэшце
рохкаць.
А жыццё —
бяжыць
без аглядкі...
Шчокі гладкія,
як глыжы
(пад’еў — і ляжы).
Ды падыме пытанне
трывогай:
а ці той іду я дарогай?
А ці так?
А ці там?
А ці з тым?
А ці з тою?..
Пахне сытасць бядою.
Акраплюся святою вадою
і ля трох дарог я прыстою...
А пайсці дарогай якою?
Там, дзе радасць ёсць неспакою!

## ДА ВАС...

Даруйце мне,
што не анёльствам я пазначаны,
сабе суддзя, сабой абвінавачаны.
Знак ганьбы —
на жыцця маёй руцэ кружляе крыгай...
А жыцця вада цячэ.
Не растае крыга — толькі камянее:
вада сінее, а яна — чарнее.
З глыб, каля шархоткае кугі,
паклічуць мяне на споведзь багі...
Не зможам мы каханымі назвацца:
мне ачышчацца шчэ ды ачышчацца,
і з вашай чысцінёй мне не зраўняцца!
Вы для мяне — і потым, і цяпер —
нібы для Пушкіна каханка Керн...
Зусім не на Зямлі, а ў вышнім Космасе —
у пошуках блукаюць нашы постаці.
Вашу руку я ў Космасе лаўлю...
Паверце мне: я шчыра вас люблю!
Мажліва ў высях паднябесных
мы непадобныя да сённяшніх, цялесных...
І тут вось, на Зямлі,
у гэтым брудзе,
мы — проста грахаводнікі...
Ці людзі?

## ПАЖАДАННЕ

*Наташы*

Хай табе без мяне будзе шчасна —
святло радасці ў хаце не гасне...

Ты са мной абышлася крута —
перад шчасцем стаю банкрутам...

І адмовы твае ўспамінаю —
ды жыву вось, не паміраю.

Хай табе без мяне будзе рай...
Успамінай мяне — не ўспамінай.

* * *

Узрост —
асядае рост...
Не хапае
кіпення,
цярпення,
гарэння...

Узрост —
нібы гэта ўсё
некуды знёс
і згубіў,
і развеяў...

І, грэшным, —
нам застаюцца
рэшткі
таго,
што было
спаўна.

Вайна
з узростам
вядзецца
няпроста.
Але,
як з каростай,
бой вядзецца
з узростам!

## НЕРАЗБЯРЫХА...

Неразбярыха —
пануе бязладдзе і ліха.

У неразбярысе,
народ мой, — збярыся
і розуму дай свабоду,
а думам — смеласць і волю!..
Мудрасць — не ў ладзе з модай.

Засеяным быць — полю,
і скошаным быць — лугу!
Бязладдзе грымасу корчыць...
Рукам працавітым — вытворчасць!

Хто — пан,
ну, а хто — галота,
хто грошы зарабіў потам —
хай
убачыць
цвяроза
мудрасць і розум!

Бог надзяляе
па-рознаму...
Дык дайце ж
дзейнічаць
*Ро-зу-му!*

* * *

*Т.Ш.*

У голасе тваім — боль.
У голасе — твой бой...
І паражэння — боль.
Добра бывае з табой.
Ды —
боль
і
майго дня змярканне...
Ад якога такога кахання?
Гэты боль —
даўняй ранаю мучыць.
Гэты боль —
мяне вучыць
і вучыць...
Я — наіўна-бяспамятны вой.
Я іду да цябе
і — за табой...
Ізноў — *Боль...*

* * *

Маці — восемдзесят.
Сыну — шэсцьдзесят...
І ў гэткім узросце былінным —
цягне да маці сына!
Жыве ў ім яшчэ дзіцяці,
якое цягне рукі да маці!
Поцяг рук вышэй памянёных —
нахай будзе
навек блаславёны!

## У ТВАІМ СЭРЦЫ...

*Н. Г—ай*

***1***

Не таміцца
табе па мне.
І жывеш ты
ў раскошы-журбе
ўва мне.
А журбота,
як дзіравыя боты,
выклікае заўсёдны сум.
Я ж табе —
захапленне нясу ў вачах.
Ты —
чытай яго па начах
ці ў сваіх
неласкавых днях...
Я не веру,
што век мой ачах —
ты чытай
захапленне ў вачах...
Мо, сказанае —
ёсць памылка?
О, не шлі мне толькі
ўхмылку,
не шлі...
Наталі!

***2***

Я цябе
люблю па-ранейшаму,
і любові
ў сэрцы не меншае,
а ў правіднасці —
ясныя вочы...
Мне з табою
побач не крочыць,
не раўня
надвячорак дню...
Я пустое табе гаманю —
ты ідзі
ў жыцця глыбіню,
вышыню,
да здзяйснення нябёсаў...
Я жадаю —
святлейшага лёсу!

## КАЛЕГАМ

Здаецца, мы — не сычы
і не крумкачы,
ды ўмеем усё ж падсачыць,
дзе памылка ці хіб калегі...
Збеглі адносін адлегі —
коле дакор, як зімой маразы.
Дзе?
Чые не так скрыпяць палазы
паводзін?
Пляткарства жыве на выгодзе,
харч — абмеркаванне паводзін...
Аніводзін
чалавек не бязгрэшны —
нават той,
хто піша ўпотайкі вершы.
Не тва́ры,
а маскі бяздушша лічы...
Дзе даравальнасці
аб-ліч-чы?

## КРЫК ЛУГУ

Лугі сівеюць восенню, калі
зямлю пакрыюць панцырам марозы...
Лугі — зялёначубымі былі.
А травы ўсе — раслі,
уверх раслі...
Пакуль не ўчулі халадоў пагрозы.
Над лугам,
над раздольным і шырокім,
плылі няспешна белыя аблокі.
Здалося лугу ў вышыні той сіняй:
плывуць касцы, вясковыя мужчыны —
у лёгкіх портках, з вышыўкай — кашулях...
І думаў луг: «Ці да сябе вярну іх?..»
Ён клікаў іх —
так ад сябе далёкіх:
— Дзічэю я! — крычаў. — Не чую
вашых крокаў...
Вярніцеся, — прасіў, — мужчыны!..
Траву касіце для скаціны!
Крычаў да восені...
Сівела ў непатрэбнасці чупрына.
І вокны апусцелых хатаў
на луг глядзелі слёзна-вінавата.

* * *

*Паэту У. Кунцэвічу*

Пасмейцеся з Паэта,
з яго спаконвечнай журбы,
з прыдуманага ім Сусвету,
у якім ён — спакойна-жывы!
Нагаворам набіце аском —
ён, маўляў, жыве жабраком...
Ды ў ваш быт,
з пракіслым душком,
асвяжальным ляціць вецярком
яго слова — напеўным радком.
Хай жабракуе —
ён неба спачатку чуе,
і дзеля Бога і праўды працуе.
І пасынкам вечным
у родзе чалавечым,
як Хрыстос у паганстве
ці дваранін у мяшчанстве, —
вякуе, небыткуе...
Хто Паэта чуе?

## МАНАЛОГ ХАЛАСЦЯКА

Танцы-шманцы...
Мне б жаніцца на Святланцы!
Да яе ж — не падступіцца:
не жанчына — навальніца!..
Як жа на такой жаніцца?
Ну, а ў Клавы —
дочкі выраслі наславу.
І пры ёй там — нейкі муж...
За мяне не хоча замуж.
А ў Галіны —
дзетак, як у дрэва галінаў!
Дый пры ёй жа — муж...
Мужчына!
Не прыткнуцца да Галіны...
А ў Ірыны —
усё так, як і ў Галіны,
толькі меней дзетак...
Што казаць пра гэта?
І Галіна, і Ірына —
гэта ўсё адны ўспаміны...
Ну няма мне палавіны!
Непрыкаяны сучок —
мужычок-халасцячок!
Куды час імчыцца?..
Мне з кім жаніцца?!.

## АБЯЦАННЕ

Ці ў зморы, ці ў гуморы
наабяцалі мне золата — горы...
І жыву я ў задоры:
маю ж золата — горы!
Праўда, адно ва ўяўленні,
а не ва ўласнай кішэні.
Мару... З’езджу да мора,
буду жыцьме без гора:
маю ж золата — горы!..
З абяцанняў нагоды
я чакаю ўжо годы,
быццам з мора пагоды.
Абяцанне ў сабе нашу,
не сваруся і не грашу,
а — цярпліва Бога прашу...
Абяцальшчыкам тэлефаную —
і ў адказ вось такое чую:
— Усё ў парадку, стары...
Ты йдзеш да названай гары.
Пацярпі крыху, пачакай...
І надзею ў сэрцы май —
скора будзе ля твайго ганку
ўзрэальненая абяцанка!
...У чаканні гор залатых,
я знямеў і аціх.
Чаканне без меры,
мусіць, страчвае веру —
абяцанне ж не выйдзе за дзверы...
Ну, а я — абяцанню не веру!
Яно выматала мне ўсе нервы.
Навошта гэта пісанне?
Не давайце пустых абяцанняў!

* * *

Хто мне падасць руку
цераз нягодаў раку?
На беразе голым, пустым,
ва ўзросце немаладым,
працяты болем глухім,
глытаю абразаў дым...
Колькі стаяць мне
на беразе тым —
пасівелым, немаладым?
А можа, прайшоў
мой час залаты —
і сам я наслаў
гэты з’едлівы дым?..
Адно маю права —
не быць нямым
і прабівацца
праз горкі дым
да сэрцаў, вачэй
яшчэ не пустых...
Дым...

## САНІ

Па дарогах не тых
плылі мае сані.
На пагорках крутых —
меў бы шчасця ўдых,
ды ўніз з'язджалі не самі...
Не адмыеш памылкі слязамі.
Эх вы, сані мае, вы сані!
Дзень трывожна ўглядацца стане
людскім вокам: «А з чым твае сані?..
Без любові, надзеі, усмешкі —
ну каму ты патрэбен, грэшны?!.»
А перад грэшным —
дыба ўстане да шчасця сцежка...
Мне — не да ўсмешкі.

* * *

Сталі на плоце цвікі вытыркацца...
Сталі штосьь землякі
ўхмыляцца.
Не мёд, а жыццёвыя аперацыі
мелі, напэўна, рацыю:
выпрабоўвалі на цярпенне,
на змірэнне і прымяненне —
з мітуслівым і жорсткім днём
і болем-агнём...

Іспытаў жыццё дабаўляе,
і гне да зямлі, схіляе.
Нават здаравякі —
за плот хапаюцца,
за цвікі...

Ад сябе ганю —
злосці гайню
і трымаюся за дабрыню!
І сваю дабрыню,
як магу,
даю кожнаму дню!

## ПАЭТЦЫ НАТАШЫ НІКАНЧУК

Хвала Богу, яшчэ
ў цябе мала начэй —
бездапаможных вачэй...
Ноч —
пакутных воч.
Ноч —
адчайных воч.
Ноч —
бяссонных воч...
Няўжо Бог сурочыць
наканавання вочы?
Ці мы самі былі ахвочы
несвядома
заказваць вочы
ў ночы?..
І дзе сапраўды —
боль праўды?
Не паперамаралля —
Наталля
мусіць сабе сурочыць
шчасныя ночы!
Бо раніцай —
усім усміхаецца...
Бог з Наталляй
вітаецца!..

## АДНОСІНАЎ САД

А нашых адносінаў сад
мае адно — недагляд...
Святла любові ён просіць,
і ў ім — удавою восень,
заплюшчыўшы вочы, блукае:
штось шукае — не дашукае...
Хто ж наслаў у наш сад,
дзе вецер у голлях галосіць,
гэтую восень?
Я адказу, як быццам, не маю,
ды — віна мая ўсплывае...
І віною
маёю
наш сад напаўняе.
Там — лісцё на зямлі,
як забітае птаства,
і там — яблыні ў вечным манастве.
Сад не можа быць у недаглядзе
з пахмурнасцю ў яго паглядзе...
Мне памылак не адмаліць,
мне душу сваю не адбяліць!
Стыне дзень — і душа яго стыне.
Ты — у тым садзе не гаспадыня...
Разважаю цяпер вось, восенню,
я пра нашы адносіны —
і чытаю ў тваім паглядзе:

мне адному застацца,
плывем мы дадому.)
Ад сну адышлі паплавы:
кур-лы, кур-лы, кур-лы...
На лаўцы дзяды закурылі:
кур-лы, кур-лы, кур-лы...
— Добры дзень, паплавы! —
з неба крычаць журавы.

P. S.
Яны не мусяць
жыць без Беларусі!

## НЕ РАБІЦЕ З ЯБЛЫНЯЎ ДРОЎ

Самотныя песні яблыняў,
самотныя песні ўдоў,
самотныя песні кароў...

Не рабіце з яблыняў дроў,
пашкадуйце самотных удоў...

А што тычыцца кароў —
на карову з ласкай глядзіце:
і накарміце,
і падаіце...
І малака папіце.
Жывіце — на будзь здароў!

Не рабіце з яблыняў дроў...

* * *

Пакуль спяваюць паэты —
жыццё іх песняй сагрэта.

Дайце паэтам —
па кабінету...
Не палітычнаму,
а — паэтычнаму!

А гэты кабінет-пакой —
ой-ёй-ёй!..
Край занядбаны мой!

## ТАБЕ

Мне смеласці не хапае
сказаць табе, што кахаю...

Сэрцам цябе хапаю —
ад сэрца снягі адмятаю...

Сэрцам цябе хапаю...

У сэрцы —
жыве Няверца.
Халодны Няверца
з зімовага краю
на сэрца снягі намятае...
Сэрца —
б’ецца з Няверцам.

Сэрцам цябе хапаю...

Ці пазнаеш мяне?
Ці пазнаеш?..
*К а х а ю!*

## ЦЬМЯНЫЯ ШЫБЫ

*Москва, ул. Москвина, 5*
*«В этом дому жил известный*
*советский поэт С. А. Есенин».*

Цьмяныя шыбы ў аконнай раме.
Гулкі пад'езд, як скляпенне...
Тут, у камедыі вечнай і драме,
паэт жыў — Сяргей Ясенін.

Цесна ў каробцы пакоя думам...
Думы шукалі бязмежжа.
У гэты пакой ён спяшаўся ад тлуму.
І ў тлум вяртаўся —
залежны...

І ў ціхі час песні тут нараджаліся —
споведзь і лекі ад скрухі.
Зоры над горадам гуртам збіраліся
песні яго паслухаць.

Песні яго, як балючая памяць
дзён тых, што канулі ў Леце...
Неба вачыма паэта гляне —
і запяе яго песнямі
вецер.

## Змест

*Музыка зораў* ........ 4
** * * Як у здзічэлых лясах* ........ 5
*Маці* ........ 6
** * * Не кліч кляцьбу з нябёсаў* ........ 13
** * * Нясу на сабе сто мяхоў* ........ 14
*Крыжы* ........ 15
** * * Я тваю цішыню* ........ 16
*Няўжо?..* ........ 17
*Вочы сінія...* ........ 18
*Радаўніца* ........ 19
** * * У сварках* ........ 20
** * * Вольная, свавольная,* ........ 21
*У вянок каханай...* ........ 22
*Паміж мною ды ім...* ........ 29
*Тры вершы* ........ 31
*Званы любові...* ........ 34
*Хата* ........ 35
** * * Як самы шкадлівы школьнік* ........ 36
** * * Я — нічыйны,* ........ 37
** * * Ах, жанчына-пяшчота* ........ 38
*Разумею...* ........ 39
*Паэзія* ........ 40
** * * Не жадаю нікчэмнае волі* ........ 43
*Скруха* ........ 44
*Пра ману* ........ 45
*Дзень-алень* ........ 46
*Маўчана* ........ 47
*Сонца ў сэрцы...* ........ 52
*Балада пра згоду* ........ 54
** * * У пустыні — пяскі пустыя* ........ 56
*Стварэнне духу* ........ 57
*Псіхалагічны момант* ........ 58
*Бывае і так...* ........ 59
*Доўг* ........ 60
** * * На пахаванні маці* ........ 61
** * * Землякі* ........ 62
*Хто вінаваты?..* ........ 63
** * * Падзяліўся парламент* ........ 64
** * * Цалую ледзь цёплыя вусны я* ........ 65

*Наадварот* ........ 66
*Сабесейбіту* ........ 67
** * * Сардэчнасць* ........ 68
** * * У вокнах — сінь-чысціня* ........ 69
** * * Вугал мядзведжы — многа ежы* ........ 70
*Да вас...* ........ 71
*Пажаданне* ........ 72
** * * Узрост — асядае рост* ........ 73
*Неразбярыха...* ........ 74
** * * У голасе тваім — боль* ........ 75
** * * Маці — восемдзесят.* ........ 76
*У тваім сэрцы...* ........ 77
*Калегам* ........ 79
*Крык лугу* ........ 80
** * * Пасмейцеся з Паэта,* ........ 81
*Маналог халасцяка* ........ 82
*Абяцанне* ........ 83
** * * Хто мне падасць руку* ........ 84
*Сані* ........ 85
** * * Сталі на плоце цвікі вытыркацца* ........ 86
*Паэтцы Наташы Ніканчук* ........ 87
*Адносінаў сад* ........ 88
*Не рабіце з яблыняў дроў* ........ 90
** * * Пакуль спяваюць паэты* ........ 91
*Табе* ........ 92
*Цьмяныя шыбы* ........ 93

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Уладзімір Кірылавіч ЦІШУРОЎ

Маўчана

Вершы

Рэдактар *А. Масарэнка*
Карэктар *Н. Дарафейчык.*
Камп‘ютарны набор і вёрстка *Д. Андрэеў*
Адказны за выпуск *Г. Вінярскі*